# ФРАНЦЫСКАНСКАЯ СІСТЭМА АДУКАЦЫІ Ў XIII ст.: ПРАБЛЕМЫ СУАДНОСІН ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ І РЭЛІГІЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

***А. А. Рахоўская***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, elenarahovskaya99@mail. ru*

Артыкул прысвечаны эвалюцыі адносін ордэна францысканцаў да інтэлектуальнай дзейнасці на працягу XIII ст. Аўтар засяроджвае ўвагу на пераломных падзеях у гісторыі гэтага працэсу. Адносіны ордэна да навучання прама ўплывалі на яго інтэлектуальную, навуковую і рэлігійную дзейнасць, да таго ж яны развіваліся ў кантэксце іншых унутрыордэнскіх працэсаў, і іх вывучэнне дае магчымасць лепш зразумець агульны стан ордэна ў XIII ст. У XIII ст. ордэн знаходзіўся на этапе свайго станаўлення, і палітыка кіраўніцтва па пытаннях суадносін інтэлектуальнай дзейнасці з іншымі заняткамі братоў, перш за ўсё з рэлігійнымі, яшчэ была зменлівай. У артыкуле разглядаюцца прычыны, дзякуючы якім ордэн канчаткова абраў шлях у навуковую дзейнасць, а манах-францысканец набыў вобраз вучонага, адукаванага чалавека, які захоўваецца за ім усе далейшыя часы.

***Ключавыя словы:*** францысканцы; адукацыя ў сярэднія вякі; францысканская адукацыя; універсітэт; рэлігійнасць.

# ФРАНЦИСКАНСКАЯ СИСТЕМА ОБРАЗОВАНИЯ В XIII В.: ПРОБЛЕМЫ СООТНОШЕНИЯ ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНОЙ И РЕЛИГИОЗНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

***Е. А. Раховская***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, elenarahovskaya99@mail. ru*

Статья посвящена эволюции отношений ордена францисканцев к интеллектуальной деятельности на протяжении XIII в. Автор обращает внимание на переломные события в истории этого процесса. Отношение ордена к обучению прямо влияло на его интеллектуальную, научную и религиозную деятельность, к тому же они развивались в контексте других внутриорденских процессов, и их изучение дает возможность лучше понять общее состояние ордена в XIII в. В XIII в. орден находился на этапе своего становления, и политика руководства по вопросам соотношения интеллектуальной деятельности с другими занятиями братьев, прежде всего с религиозными, была изменчивой. В статье рассматриваются причины, благодаря которым орден окончательно избрал путь в научную деятельность, а монах-францисканец приобрел образ ученого, образованного человека, сохранившийся за ним на все дальнейшие времена.

***Ключевые слова:*** францисканцы; образование в средние века; францисканское образование; университет; религиозность.

# THE THIRTEENTH-CENTURY FRANCISCAN EDUCATION SYSTEM: PROBLEMS OF CORRELATION OF INTELLECTUAL AND RELIGIOUS ACTIVITY

***A. A. Rakhouskaya***

*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: A. A. Rakhouskaya (elenarahovskaya99@mail. ru)*

The article is devoted to the evolution of the relations of the Franciscan Order to intellectual activity during the 13th century. The author draws attention to the main points of the history of this process. The order's attitude to learning influenced its intellectual, scientific and religious activities, moreover, it developed in the context of other intra-order processes. And studying these processes make it possible to better understand the general state of the order in the 13th century. The order was at the stage of its formation, and the policy of the leadership on the correlation of intellectual activity with others was changeable in the 13th century. The article discusses the reasons, why the order finally chose the path to scientific activity, and the Franciscan monk acquired the image of a scientist, an educated person, which he retained for all future times.

***Key words:*** Franciscans; education in the Middle Ages; Franciscan education; university; religiosity.

На працягу XIII ст. Францысканскі ордэн прайшоў шлях ад «апостальскага руху» да асобнай карпарацыі, пры чым не проста рэлігійнай, але і вучонай. У сваіх адносінах да адукацыі і інтэлектуальнай дзейнасці ордэн прайшоў некалькі этапаў. Першапачаткова прастамоўная францысканская пропаведзь узнікла як супрацьпастаўленне цяжкай для ўспрыняцця народам, перагружанай філасофскімі разважаннямі, сімвалізмам і пафаснасцю біскупскай пропаведзі. У гэтай сувязі Францыск не ўхваляў інтэлектуальныя заняткі братоў [1, с. 132–133].

Аднак з пашырэннем дзейнасці ордэна стала відавочнай прамая сувязь паміж паспяховым вядзеннем дыспутаў на рэлігійныя тэмы і неабходнасцю адукацыі манахаў, якія займаліся місіянерствам і прапаведніцтвам. Гэтая акалічнасць прымусіла Францыска ў 1224 г. даць афіцыйны дазвол Антонію Падуанскаму на арганізацыю лекцый для манахаў, але тут жа асабліва падкрэслівалася, што рэлігійная дзейнасць павінна быць на першым месцы сярод манаскіх заняткаў: «Жадаю я, каб ты чытаў братам святую тэалогію, абы сярод гэтых трудоў ты не пагасіў дух малітвы і набожнасці, як патрабуе гэтага наш Статут» [2].

Першыя францысканскія школы для манахаў былі створаны ў 1228 г. у Магдэбургу і ў Парыжы, ў 1229 г. – у Оксфардзе, а ў 1230 г. – у Кембрыджы. У гэты ж час працягвалі існаваць курсы для манахаў у Балоны, а таксама францысканцы выкладалі ў Падуі [3, p. 91–93]. Ужо

брат Салімбене ў сваёй Хроніцы асуджае невуцтва і падкрэслівае, што «адзіная добрая якасць брата Іліі (генеральны міністр у 1232–1239 гг.) складалася ў тым, што ён падштурхнуў ордэн братоў-мінарытаў на заняцце багаслоўем» [4, с. 114].

Так ішоў працэс асцярожнага, з аглядкай на рэлігійныя абавязкі (малітва, пропаведзь), наладжвання навучання манахаў. У кантэксце гэтага працэса ордэн сутыкнуўся з універсітэтамі. У 1223 г. францысканцы былі дапушчаны да выкладання ў Парыжскім універсітэце, а ў 1230-я гг. яны атрымалі там сваю кафедру на тэалагічным факультэце [6, с. 166, 169]. Прыхільнікам уваходжання францысканскага ордэна ва ўніверсітэт быў папа Рыгор IX, але ён не столькі клапаціўся пра навуковую дзейнасць ордэна, колькі разлічваў выкарыстоўваць менавіта моцную францысканскую рэлігійнасць для ўраўнаважвання вучонасці ўніверсітэта, якая магла прывесці яго да ерасі [6, с. 145].

Станаўленні прыязных адносін ордэнскага кіраўніцтва да адукацыі манахаў, а як след уцягванню іх у навуковую дзейнасць, перашкаджаў страх, што інтэлектуалы схільныя да ерасей. Напрыклад, правінцыяльны міністр Англіі ў 1224–1236 гг. Агнеліус Пізанскі, які спачатку сам запрасіў выдатнейшага тэолага з Оксфардскага ўніверсітэта навучаць маладых францысканцаў, хутка вырашыў спыніць адукацыю манахаў пасля таго, як даведаўся, што браты распачалі дыспут на тэму «Аб існаванні Бога». Такім чынам, для шматлікай часткі францысканцаў адукацыя і навука атаясамляліся з ерытычнасцю, што яскрава адлюстравана ў словах вышэйназванага Агнеліуса Пізанскага: «Нажаль! Простыя і непісьменныя браты паглыбляюцца ў разважанні пра Бога, а адукаваныя браты абмяркоўваюць, ці існуе Бог!» [7, p. 37–38].

І не дзіўна, што ў 1220–40-я гг. за пашырэнне інтэлектуальнай дзейнасці ордэна выступала меншасць братоў – група Аляксандра Гэльскага. Асноўная ж маса, асабліва генеральныя міністры, прытрымліваліся тактыкі дыстанцыявання ад універсітэцкай прасторы і аддавалі перавагу практычнай рэлігійнай дзейнасці – пропаведзі і малітве. Гэта адлюстравана ў «Другой легендзе» Фамы Чаланскага, створанай як раз у 1240-я гг., дзе вучонасць атаясамляецца з асаблівай формай маёмасці, ад якой пажадана адмовіцца пры ўступленні ў ордэн. А з вуснаў Св. Францыска гучаць перасцярогі братам, якія захапляюцца навукамі, бо гэтыя заняткі і кнігі не прынясуць карысці на будучым Страшным судзе, таму аднаму брату замест Псалтыры Францыск даў попел [8, с. 494–495].

Пазіцыя кіраўніцтва разыходзілася з інтарэсамі адукаванай часткі ордэна, якая ўсё больш імкнулася да інтэлектуальных заняткаў, аб чым з незадаволенасцю казаў генеральны міністр ў 1247–1257 гг. Іаан Пармскі: «Ордэн складаецца з двух муроў: святых паводзінаў і навучання; браты ўзнялі мур навучання да такіх высокіх нябёсаў, што пачалі дыскутаваць пра само існаванне Бога, у той час калі мур святых паводзін пакінулі такім нізкім, што лічылася вялікім дасягненнем сказаць пра брата проста, што ён надзейны чалавек» [9, p. 204].

Працэсам уваходжання манахаў ва ўніверсітэцкую прастору былі незадаволены не толькі францысканскія генеральныя міністры, але і ўніверсітэцкая прафесура. Найбольш значныя канфлікты жабрацкіх ордэнаў адбыліся з Парыжскім універсітэтам [10, с. 29]. Крытыка і нападкі з боку ўніверсітэцкай супольнасці далі імпульс да канчатковага абрання адной генеральнай лініі па пытанню навучання і інтэлектуальнай дзейнасці. І такім чынам, канфлікт з універсітэтам аказаў вялікі ўплыў на далейшае станаўленне ордэна францысканцаў як вучонай супольнасці [6, с. 207–208].

Новы генеральны міністр з 1257 г., Банавентура, канчаткова абраў для ордэна шлях у навуку, бо лічыў, што пошук боскай ісціны – гэта самае ганаровае занятак чалавецтва. Асноўнай дзейнасцю самога Банавентуры да абрання генеральным міністрам была інтэлектуальная праца, ён навучаўся ў Аляксандра Гэльскага, таго самага, які падтрымліваў уваходжанне францысканцаў ва ўніверсітэты. Банавентура атрымаў званне прафесара францысканскай школы ў Парыжы і прафесара Парыжскага ўніверсітэта. Усё яго жыццё праходзіла ў інтэлектуальнай атмасферы багаслоўскага факультэта, і было б неверагодна, каб такі чалавек лічыў інтэлектуальную працу меньш патрэбнай і карыснай грамадству, чым працу фізічную. Банавентура прытрымліваўся меркавання, што галоўная задача братоў – рэлігійная прапаведніцкая дзейнасць, але каб даверыць манахам прапаведваць ісціну, трэба было адукаваць іх, яны павінны былі ўмець пісаць і чытаць [3, с. 143].

Паварот у палітыцы ордэна быў замацаваны ў Нарбонскай канстытуцыі 1260 г. Яна падкрэслівала неабходнасць адукацыі навіцыяў [3, с. 149], замацавала канкрэтныя прадпісанні адносна парадку адукацыі і выкладання братоў-францысканцаў у Парыжскім універсітэце [6, с. 209]. Гэты ж накірунак быў адлюстраваны ў новым жыціі Францыска, створаным самім Банавентурай у 1263 г.: у «Вялікай легендзе» Францыск ужо дазваляў пісьменным братам пасля ўступлення ў ордэн працягваць

вывучэнне Святога Пісання» [11, с 619]. Гэта быў відавочны крок насустрач інтэлектуальнай дзейнасці ў параўнанні з ранейшымі трактоўкамі.

Рысу ў спрэчках наконт карыснасці навучання для братоў у 1279 г. падвяла була «Exiit qui seminat» папы Мікалая III, якая прызнала ганаровасць і неабходнасць інтэлектуальных заняткаў братоў-францысканцаў і надала дзейнасці такога кшталту статус, роўны з фізічнай працай [12]. Дзякуючы гэтаму колькасць навучэнцаў у францысканскіх школах для манахаў значна павялічылася.

Да канца XIII ст. у Францысканскім ордэне склалася добра арганізаваная сістэма адукацыі: у кожным манастыры павінен быў быць свой лектар, у кожнай кустодзіі – школа, а мінімум два браты ад кожнай правінцыі выпраўляліся ў школы пры ўніверсітэтах. Аднак, прызнаўшы карыснасць навуковай працы, ордэнскае кіраўніцтва не пакінула па-за ўвагай рэлігійную дзейнасць манахаў-інтэлектуалаў і манахаў-студэнтаў. Яно ўсталявала шэраг правілаў паводзінаў для гэтых катыгорый братоў. Так, у 1282 г. студэнтам-францысканцам было загадана абавязкова выходзіць у горад і прасіць міласціну. У 1310 г. было забаронена мець больш кніг, чым гэта было патрэбна непасрэдна для іх працы ці навучання. У 1316 г. францысканцам было катэгарычна забаронена займацца алхіміяй. У 1331 г. францысканскім студэнтам прадпісвалася прыпыняць заняткі ў перыяды прызначаныя для прапаведніцтва і прашэння міласціны [10, p. 19–20]. Гэтая палітыка была скіравана на тое, каб браты-студэнты прымалі ўдзел у асноўнай рэлігійнай дзейнасці ўсяго ордэна і не лічылі сябе на асаблівым становішчы.

Такім чынам, да канца XIII ст. адбылося станаўленне францысканскага ордэна як вучонай супольнасці, манахі ўвайшлі ва ўсе вядучыя ўніверсітэты Еўропы і нават распачалі дыспуты з дамініканцамі, якія раней лічыліся безумоўнымі лідэрамі ў інтэлектуальнай сферы. Аднак афіцыйна рэлігійная дзейнасць лічылася для францысканцаў іх першарадным абавязкам, і гэта на яе карысць можна было ахвяраваць навучаннем, але не наадварот.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Устав, утвержденный буллой // Франциск Ассизский. Сочинения / ред. В. Л. Задворный. М.: Издательство францисканцев – братьев меньших конвентуальных, 1995. С. 121–135.

2. Послание к св. Антонию // Франциск Ассизский. Сочинения / ред. В. Л. Задворный. М.: Издательство францисканцев – братьев меньших конвентуальных, 1995. С. 201.
3. Moorman J. A History of the Franciscan Order from its origins to the year 1517. Oxford : the Clarendon press, 1968. 655 p.
4. Салимбене де Адам. Хроника / Пер. с лат. М.: «Российская политическая энциклопедия» (РОССПЭН), 2004. 984 с.
5. Pope Innocent IV Ordinem vestrum 1245 (lat) [Electronic resource]. – Mode of access: http://individual. utoronto. ca/jwrobinson/texts/inn4-ordinem-vestrum. pdf. – Date of access: 17. 04. 2020.
6. Кравцова Е. С. Францисканский орден: от апостольского движения к ученой корпорации (Франция, XIII в.). М.: СПб.: Центр гуманитарных инициатив, 2018. 320 с.
7. Chronicle of the twenty-four Generals of the Order of Friars Minor [1369–1374] / Eng. trans. by Noel Muscat OFM from the Latin text. Malta: TAU Franciscan Communications Franciscan Friars, 2010. 507 p.
8. Житие второе св. Фрациска Ассизского, составленное Фомой Челанским // Истоки францисканства. Святой Франциск Ассизский: писания и биографии. Святая Клара Ассизская писания и биография / [Пер. О. Седаковой и др.]; под общ. ред. А. Вичини. Кайшядорис: Типография им. А. Якштаса, 1996. С. 329–520.
9. Thomas of Eccleston: The coming of the friars minor to England [Electronic resource] / by Cuthbert, Father, O. S. F. C. London : Sands, 1903. 266 p. – Mode of access: https://archive. org/details/MN5112ucmf_4/page/n5/mode/2up. – Date of access: 14. 03. 2020.
10. Moorman J. The Grey Friars in Cambridge 1225–1538. Cambridge: the University press, 1952. 293 p.
11. Большая легенда, составленная святым Бонавентурой из Баньореджо // Истоки францисканства. Святой Франциск Ассизский: писания и биографии. Святая Клара Ассизская писания и биография / [Пер. О. Седаковой и др.]; под общ. ред. А. Вичини. Кайшядорис: Типография им. А. Якштаса, 1996. С. 521–704.
12. Pope Nicholas III Exiit qui seminat 1279 [Electronic resource]. – Mode of access: http://www. franciscan-archive. org/bullarium/exiit-e. html. – Date of access: 17. 04. 2020.